*рускага друку» – одно из лучших библиографических изданий Беларуси, самое оперативное и доступное. За десятилетия своего существования бюллетень приобрел широкую популярность в библиотеках страны, завоевал авторитет за ее пределами и до сих пор не потерял своей ценности и актуальности.*

*2010 celebrated its 50<sup>th</sup> anniversary the monthly bibliographic journal "New books: through the pages of Belorussian print", one of the bibliographical top editions in Belarus, the most operative and available. For decades of its existence it had got wide popularity among libraries in this country and won authority beyond its bounds and hasn't lost its value and urgency till now.*

***Дзямешка Лілія Адамаўна***
***Зыгмантовіч Святлана Вікенцьеўна***
***Паўлава Сафія Антонаўна***
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў

# ПРАЕКТНАЯ МЕТОДЫКА ЯК ЭФЕКТЫЎНЫ СРОДАК ПАДРЫХТОЎКІ БУДУЧЫХ СПЕЦЫЛІСТАЎ БІБЛІЯТЭЧНАЙ СФЕРЫ (методыка-тэарэтычны аспект)

Развіццё бібліятэчнай справы ў Рэспубліцы Беларусь накіравана на садзейнічанне рэалізацыі дзяржаўнай бібліятэчнай палітыкі, у тым ліку на здзяйсненне дзяржаўных праграм «Электронная Беларусь», «Памяць Беларусі», «Дзеці Беларусі», Праграмы па адраджэнні і развіцці вёскі, галіновай праграмы «Захаванне і развіццё культуры Рэспублікі Беларусь на перыяд 2006–2010 гг.» і інш. Ад бібліятэк патрабуецца ўдасканаленне дзейнасці ў кірунку найбольш поўнага задавальнення навучальных, сацыяльнах, інфармацыйных патрэбнасцей насельніцтва на падставе фарміравання інфармацыйных рэсурсаў і ўкаранення сучасных інфарма-

цыйных тэхналогій. Гэта дыктуе неабходнасць новых падыходаў да падрыхтоўкі будучых спецыялістаў у бібліятэчнай сферы, якія можна разглядаць як адказ на запыт сацыяльна-культурнага развіцця краіны і самой практыкі бібліятэк.

Падрыхтоўка студэнтаў па набыцці пазнавальных, грамадскіх, прафесійных кампетэнцый ажыццяўляецца комплексна і вырашаецца ў ходзе ўсяго вучэбна-выхаваўчага працэсу. Гэтаму спрыяюць вучэбныя дысцыпліны. Дысцыпліны сацыяльна-гуманітарнага і агульнаадукацыйнага блока фарміруюць веды, уяўленні студэнтаў у галіне культурна-гістарычнай спадчыны народа. Пераважай спецыяльных дысцыплін з'яўляецца задача сфарміраваць кампэтенцыі ў сферы працоўнай дзейнасці, такую місію здзяйсняюць агульнапрафесійныя, спецыяльныя дысцыпліны і дысцыпліны спецыялізацый. Вядома, што іх роля і магчымасці розныя. Так, выкладанне агульнапрафесійных дысцыплін бібліятэчна-бібліяграфічнага зместу забяспечвае фундаментальную падрыхтоўку ў асноўных і смежных галінах, стварае рэзерв ведаў, які дазваляе студэнтам адаптавацца да зменлівых умоў, развівае прафесійны інтэлект, сацыяльную і практычную накіраванасць, рацыянальнасць і крытычнасць мыслення, авалоданне метадалогіяй пазнання ў прафесійнай сферы. Спецыяльныя дысцыпліны накіраваны на фарміраванне прафесійных уменняў і навыкаў.

Агульная бібліятэчная падрыхтоўка будучых спецыялістаў знаходзіць сваю канкрэтызацыю, дакладную змястоўную напаўняльнасць у дысцыплінах спецыялізацый.

Засваенне студэнтамі змястоўнай напаўняльнасці дысцыплін, якія выкладаюцца, здзяйсняецца праз разнастайныя формы навучання. У пошуку і апрабацыі іх кафедра менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы лічыць найбольш эфектыўным выкарыстанне метаду праектаў, які вызначаецца з пукту гледжання педагогікі як «сукупнасць прыёмаў, дзеянняў навучэнцаў у іх пэўнай паслядоўнасці для дасягнення пастаўленай задачы – рашэння праблемы, значнай для навучэнцаў і аформленай у выглядзе канчатковага прадукту» [1]. Праектны метад у адукацыі – дыдактычны сродак актывізацыі пазнавальнай дзейнасці навучэнцаў, развіцця крэатыўнасці і адначасова фарміравання пэўных асабовых і прафесійных якасцей. Ён засноўваецца на выкарыс-

танні тэхналогій развіваючага навучання, накіраваных на фарміраванне рэфлексіўнага мыслення, тэхнікі праблематызацыі, дэпраблематызацыі. Тэхналогіі забяспечваюць самастойнасць, дзейнасць, выніковасць навучання [2; 3].

У бібліятэчнай практыцы ўсё большае месца займае праграмна-мэтавая (праектная) дзейнасць. У даведніках яна характарызуецца як «распрацоўка дакументных (мэтавых) праграм, канцэпцый, стратэгічных планаў, праектаў, якія вызначаюць магчымыя шляхі дасягнення адной ці некалькіх мэт выканаўцамі пры пэўным рэсурсным забеспячэнні ва ўмовах пераходу да мэтавага кіравання бібліятэкай» [4]. Усе яны дакументуюць інавацыйную палітыку бібліятэк шляхам пастаноўкі прыярытэтных мэт, удакладнення задач, выбару шляхоў вырашэння. Бібліятэказнаўцы класіфіцыруюць праекты па розных прыметах: маштабе, змесце (тэматыцы), функцыянальным прызначэнні. Так, у межах маштабу існуюць мегапраекты (рэспубліканскага, абласнога, раённага значэння), мультыпраекты (распрацоўваюцца на ўзроўні горада, раённага цэнтра), монапраекты (рэалізуюцца адной бібліятэкай). Па змесце вылучаюцца ўніверсальныя (комплексныя) і спецыяльныя.

Характэрнай асаблівасцю ўніверсальных праектаў з'яўляецца іх змястоўная шматаспектнасць, пастаноўка шэрага праблем для дасягнення больш высокага ўзроўню інфармацыйна-бібліяграфічнага абслугоўвання. Да спецыяльных можна аднесці праекты, арыентаваныя на ўдасканаленне некаторых відаў бібліятэчнай дзейнасці (камплектавання, абслугоўвання, кіравання і інш.), а таксама на паляпшэнне работы з пэўнымі групамі карыстальнікаў бібліятэк.

Зыходзячы з вызначэнняў, дадзеных у педагагічнай і бібліятэчнай энцыклапедыях, а таксама з практычнай дзейнасці бібліятэк, можна тэарэтычна абаснаваць сэнс і методыку праектнага навучання студэнтаў.

Праектнае навучанне – арганізацыя адукацыйнага працэсу, накіраванага на вырашэнне навучэнцамі вучэбных задач па самастойным зборы па зададзеных прыметах і інтэрпрэтацыі інфармацыі, абавязковага абгрунтавання і карэкціроўкі наступнай прадукцыйнай вучэбнай дзейнасці, яе самаацэнкі і прэзентацыі выніку. Навучанне пры гэтым набывае значны асабовы сэнс, што павышае матывацыю ўласна працэсу.

Укараненне ў вучэбны працэс «метаду праектаў» патрабуе з боку выкладчыка добрага ведання тэхналогіі яго распрацоўкі і выкарыстання.

Праілюструем гэты працэс падрабязна на прыкладзе выкладання курса «Бібліятэчны менеджмент» (прафесар С.А. Паўлава, дацэнт Н.Я. Пятушка). У ходзе лекцый і семінарскіх заняткаў студэнты замацоўваюць веды па праектнай дзейнасці бібліятэк, на практычных занятках разглядаюць розныя праблемныя сітуацыі, удакладняюць мэты, задачы, тэрміны работы над праектамі, распрацоўваюць мадэль мэтавай праграмы.

Укараненне праектнай методыкі характарызавалася наступнымі этапамі дзейнасці выкладчыкаў і студэнтаў:

1. *Вызначэнне тэмы праекта.* На гэтым этапе навучанне носіць яскрава выражаны практыка-арыентаваны характар, што дазваляе ўстанаўліваць і падтрымліваць цесныя сувязі з заказчыкамі – бібліятэкамі. Відавочна, што ўжо на першым этапе метад праектаў арганічна спалучаецца з метадам навучання, што важна і для праектнай дзейнасці бібліятэк.

Тэматыка праектаў фарміравалася спецыялістамі цэнтралізаванай сістэмы дзіцячых бібліятэк г. Мінска, Цэнтральнай бібліятэкі імя Я. Купалы, Мінскай абласной бібліятэкі імя А.С. Пушкіна ў межах рэспубліканскай праграмы «Дзеці Беларусі»; частка праектаў прапанавалася выкладчыкамі з улікам вучэбнай сітуацыі, прафесіянальных інтарэсаў, здольнасцей студэнтаў. Тэматыка праектаў таксама прапанавалася студэнтамі, якія арыентаваліся на асабовыя пазнавальныя і творчыя інтарэсы.

2. *Арганізацыя творчых груп.* Студэнты аб'ядноўваюцца ў творчыя групы, у кожнай з якіх вылучаецца каардынатар. Ён кіруе і кантралюе ўдзел студэнтаў у распрацоўцы праекта, падтрымлівае сувязі і атрымлівае кансультацыі ад работнікаў бібліятэк, выкладчыкаў. Для кожнай творчай групы выкладчыкі аб'ядноўваюць заданне вучэбнай, пазавучэбнай і самастойнай работы студэнтаў, арыентуюць іх на супрацоўніцтва. У групах адбываецца размеркаванне абавязкаў з улікам патэнцыяльных асабовых здольнасцей стдэнтаў.

3. *Выбар творчымі групамі тэм праектаў.* Кожная творчая група разам з метадыстамі, работнікамі аддзелаў абслугоўвання

бібліятэк выбіраюць тэмы мультыпраектаў, абмяркоўваюць магчымыя крыніцы інфармацыі, прагназуюць канчатковы вынік дзейнасці.

4. *Вызначэнне творчай групай відаў дзейнасці і стварэнне плана рэалізацыі мультыпраекта.* Каардынатар групы (пры неабходнасці разам з выкладчыкам) размяркоўвае віды дзейнасці паміж удзельнікамі праекта, пасля чаго група складае план работы над мультыпраектам. Ён таксама прызначае адказных за кожную пазіцыю плана і вызначае тэрмін яго выканання.

5. *Рэалізацыя планаў мультыпраектаў.* Гэты этап – самы інтэнсіўны і творчы: здзяйсняецца непасрэдная распрацоўка праекта ў бібліятэках. Студэнты назапашваюць інфармацыю, працуюць з ёю, даследуюць праблемы, абмяркоўваюць розныя варыянты афармлення і прадстаўляюць праекты. Кожны ўдзельнік групы ўносіць свой асабовы ўклад у агульную справу. Сумесная работа над праектам дае магчымасць стварэння пазітыўнай узаемазалежнасці студэнтаў і забяспечвае індывідуальную ацэнку работы кожнага ўдзельніка і групы ўвогуле.

6. *Прэзентацыя праектаў.* Абарона мультыпраекта першапачаткова адбываецца на практычных занятках у студэнцкіх групах. Студэнты сумесна з выкладчыкамі сярод 30 прадстаўленых праектаў адбіраюць лепшыя і рэкамендуюць на агульную прэзентацыю праектаў па патоку.

Формай прэзентацыі вызначаецца круглы стол, куды запрашаюцца выкладчыкі факультэта і прадстаўнікоў бібліятэк.

Пры абароне праекта ўлічваюцца:

– арыгінальнасць і якасць прадстаўленага матэрыялу;

– аб'ём і глыбіня ведаў па тэме, эрудыцыя, міжпрадметныя сувязі;

– культура мовы, выкарыстанне наглядных сродкаў;

– адказы на пытанні, паўната, аргументаванасць.

У 2009 г. прадстаўніцтва на прэзентацыі праектаў было значным і ўнікальным. Аб гэтым сведчыць склад удзельнікаў круглага стала. У абмеркаванні студэнцкіх праектаў удзельнічалі загадчык кафедры менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы С.В. Зыгмантовіч, выкладчыкі факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый: С.А. Паўлава, Н.Я. Пятушка, Л.А. Дзямешка, В.М. Бігеза, Н.А. Ляйко, А.У. Фядорына; прадстаўнікі бібліятэчнай гра-

мадскасці: дырэктар Прэзідэнцкай бібліятэкі С.В. Юдо, намеснік дырэктара бібліятэкі Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта Г.А. Масюк, старшыня Беларускай бібліятэчнай асацыяцыі, дырэктар Мінскай абласной бібліятэкі імя А.С. Пушкіна Н.А. Чуева, загадчык аддзела бібліятэказнаўства гэтай бібліятэкі В.А. Малюга, загадчык дзіцячай бібліятэкі № 16 г. Мінска В.І. Ціткова, дырэктар Цэнтралізаванай сістэмы дзіцячых бібліятэк (ЦСДБ) г. Мінска Т.А. Швед, загадчык аддзела бібліятэчнага маркетынгу ЦСДБ г. Мінска А.П. Карзанава, вядучы метадыст ЦСДБ г. Мінска В.С. Вовк, намеснік дырэктара Цэнтралізаванай сістэмы гарадскіх публічных бібліятэк г. Мінска В.М. Грынчук, спецыяліст аддзела маркетынгу гэтай сістэмы Т.М. Сухадолава, намеснік дырэктара бібліятэкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў І.Б. Стралкова.

Удзельнікі круглага стала былі прыемна ўражаны дыяпазонам тэматыкі (студэнтамі распрацавана 30 праектаў, з якімі можна пазнаёміцца ў электроннай бібліятэцы Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў), якасцю праектаў, іх адраснасцю. Так, у межах вучэбна-вытворчага комплексу «кафедра менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы – Цэнтралізаваная дзіцячая бібліятэчная сістэма г. Мінска» былі прадстаўлены праекты:

– для філіяла № 16 – два праекты «Інфармацыйная культура і дзеці» (студэнты 437 гр. В. Сінькова, В. Бельчыкава), «Цэлы свет – дзецям» (студэнты В. Гаўрыльчык, П. Дубінская);

– для філіяла № 11 – «У гармоніі з прыродай» (Н. Кавецкая, В. Данільчанкава, С. Сундукова);

– для філіяла № 14 – «Дзеці і бацькі – псіхалогія стасункаў» (В. Жураўлёва, П. Славашэвіч, А. Хілько);

– для філіяла № 6 – «Война глазами трех поколений» (К. Мыслівец, К. Якімёнак, В. Бурак, І. Кастаглотава);

– для філіяла № 3 – «Чтение – путь к образованию» (М. Марахоўка, Н. Берасневіч, В. Лубінская), «Зямля бацькоў – твая зямля» (Ю. Лабовіч, Н. Рагачэўская);

– для Цэнтралізаванай гарадской бібліятэкі імя Я. Купалы – «Алея чытачоў» (А. Дубіцкая, В. Гусева, В. Сягай), «Жаночы інфармацыйны цэнтр» (Х. Чарняўская, А. Ашкінадзе), «Вайна ў лёсе маёй сям'і» (В. Мерчы, В. Санюк).

Для вышэйшых навучальных установ быў падрыхтаваны праект «Віртуальная даведачная служба бібліятэк ВНУ» (В. Мініч, Ю. Уцянок, А. Яроменка), а для зацікаўленых бібліятэк – праект «Online-інфармацыя – крок у будучыню» (А. Міхайлава, А. Еўсцігнеева, Н. Конан).

Не менш цікавымі з'яўляюцца і рэгіянальныя праекты, якія распрацоўваліся студэнтамі па ўзгадненні з кіраўніцтвам бібліятэк рэгіёнаў. Найбольш змястоўныя з іх наступныя:

– для Цэнтральнай бібліятэкі г. Мар'іна Горка – «Школа – территория закона» (Т. Лібар, В. Скачок);

– для Стаўбцоўскай раённай бібліятэкі – «Цыкл мерапрыемстваў па папярэджванню агрэсіі і жорсткасці сярод падлеткаў» (Т. Крыжаноўская, Н. Архіпенка);

– для Глускай раённай бібліятэкі – «Адраджэнне і захаванне культурна-гістарычнай спадчыны Глускага раёна» (В. Бурда, Н. Лемешава, С. Ляпко);

– для Лунінецкай цэнтральнай раённай бібліятэкі – «Прафілактыка правапарушэнняў сярод школьнікаў» (А. Шпакоўская, А. Розмысла);

– для Полацкай цэнтральнай бібліятэчнай сістэмы – «Создание информационного центра по генеалогии и генеалогическим исследованиям» (Д. Ганчар, С. Федуковіч).

Прадстаўленыя праекты атрымалі высокую ацэнку як з боку выкладчыкаў, так і з боку прадстаўнікоў бібліятэк. Шэраг праектаў былі запатрабаваны бібліятэкамі адразу пасля іх прэзентацыі.

У ходзе абмеркавання адзначалася эфектыўнасць праектнай методыкі як рэзультатыўнага падыходу да навучання студэнтаў. Усе прысутныя сышліся на меркаванні, што праектная методыка дазваляе:

– спалучаць перавагі праектна-даследчага метаду і магчымасці інфармацыйных тэналогій;

– ствараць аптымальныя ўмовы для самарэалізацыі як студэнтаў, так і выкладчыкаў;

– максімальна развіваць індывідуальныя патэнцыяльныя здольнасці студэнтаў;

– арганізоўваць цеснае ўзаемадзеянне і камунікатыўныя адносіны паміж членамі групы, выкладчыкамі і супрацоўнікамі бібліятэк;

– фарміраваць і развіваць даследчыя ўменні і навыкі, творчыя здольнасці ўсіх удзельнікаў праекта;

– засяроджваць увагу як на індывідуальнай рабоце, так і на сумесных дзеяннях над рашэннем вытворчых праблем;

– браць індывідуальную адказнасць за выкананне тых ці іншых вытворчых задач.

Прэзентацыі таксама сведчылі аб эфектыўнасці праектнай методыкі ў кірунку развіцця эмацыянальнай сферы будучых спецыялістаў. Студэнты яскрава выказалі задаволенасць ад выкананага задання, праявілі пачуццё прафесійнай годнасці, упэўненасці, пазітыўныя адносіны да сваіх аднакурснікаў, будучай прафесійнай дзейнасці, асэнсавалі матывацыю самаактуалізацыі і самаўдасканалення.

ЛІТАРАТУРА

1. **Метод** проектов [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://Wikipedia.org/wiki.

2. **Новые** педагогические информационные технологии в системе образования : учеб. пособие / под. ред. Е. С. Полат. – Москва : Издательский центр «Академия», 2001. – 154 с.

3. **Intel** «Обучение для будущего» (при поддержке Microsoft) : учебн. пособие. – 5-е изд., испр. – Москва : Издательско-торговый дом «Русская Редакция», 2005. – 368 с.

4. **Библиотечная** энциклопедия. – Москва : Пашков дом, 2008. – С. 826.

*В статье определена эффективность проектного обучения студентов, теоретически обоснован его смысл, очерчены основные этапы внедрения проектной методики в практическую деятельность библиотек.*

*In article is defined efficiency of design formation of students, is theoretically proved its sense, are outlined the basic stages of introduction a design technique in practical activities of libraries.*